СМЕРЦЬ НЯМЕЦКІМ АКУПАНТАМ!
Камуністычная партыя (бальшавікоў) Беларусі.

# СТАЛІНЕЦ

ОРГАН ГРЭСКАГА РК КП(б)Б

№ 6 (737) | Серада, 26 студзеня | 1944 г.

**Працоўныя раёна!** Немцы абвявілі ўсеагульную мабілізацыю насельніцтва ад 16 да 55 гадоў, а таксама гвалтоўна бяруць людзей у паліцыю, з мэтай вывезці наш народ на катаргу ў Германію і заставіць нашых людзей ліць кроў за немцаў.

Не паддавайцеся на нямецкую правакацыю, не з'яўляйцеся на службу ў паліцыю. Ваша месца ў радах партызан. Скора, зусім скора Чырвоная Армія прыйдзе да нас.

## Новыя поспехі Чырвонай Арміі

Кожны дзень з франтоў Айчыннай вайны прыходзяць радасныя весткі. Воіны Чырвонай Арміі ламаюць усе нямецкія ўмацаванні, якія гітлераўцы лічылі непрыступнымі.

Пад магутнымі ўдарамі нашых войск немцы адкатваюцца на захад. Гомель, Мозыр, Жытомір, Калінкавічы, Ноўгарад, Мга, другія гарады і тысячы населеных пунктаў вызвалены ад нямецкіх акупантаў.

Наступальны парыў Чырвонай Арміі ўсё ўзмацняецца. Нашы войскі граміць ворага на Украіне і Беларусі. Войскі Ленінградскага і Волхаўскага франтоў, перайшоўшы ў наступленне, толькі за 5 дзён баёў адбілі ў ворага вялікую тэрыторыю. Немцы страцілі забітымі звыш 40.000 сваіх салдат і афіцэраў. Нашы войскі захапілі вялікія трафеі і 4.000 палонных.

Працоўныя раёна! Чырвоная Армія падходзіць да раёнаў Мінскай вобласці. Чырвоныя воіны змагаюцца, каб скарэй вызваліць нас ад нямецкай няволі. Зараз, як ніколі, патрэбна ўсіліць дапамогу фронту, на кожным кроку знішчаць немцаў і паліцэйскіх.

Партызаны і партызанкі! Яшчэ мацней наносце ўдары па тылах праціўніка. Зрывайце перакідку сіл і тэхнікі ворага да лініі фронта.

Слава воінам Чырвонай Арміі, якія нясуць нам вызваленне ад нямецкай тыраніі!

Слава Вярхоўнаму Галоўнакамандуючаму, Маршалу Савецкага Саюза таварышу Сталіну!

## Урачыста-жалобнае пасяджэнне, прысвечанае 20-ай гадавіне з дня смерці В. І. ЛЕНІНА

21 студзеня ў Маскве, у Вялікім зале Крэмлёўскага палаца адбылося ўрачыста-жалобнае пасяджэнне ЦК ВКП(б), Маскоўскага абласнога і гарадского камітэтаў ВКП(б), Прэзідыумаў Вярхоўнага Совета СССР і РСФСР, Маскоўскага абласнога і гарадскога Советаў дэпутатаў працоўных, ЦК ВЛКСМ, МК і МГК ВЛКСМ, Прэзідыума ВЦСПС сумесна з прадстаўнікамі партыйных і грамадскіх арганізацый і Чырвонай Арміі, прысвечанае 20-ай гадавіне з дня смерці В. І. ЛЕНІНА.

У 6 гадзін 30 мінут за сталом прэзідыума з'яўляюцца т.т. Сталін, Молатаў, Калінін, Кагановіч, Андрэеў, Мікаян, Берыя, Швернік, Маленкоў, Шчэрбакоў, Вазнесенскі. Удзельнікі ўрачыста-жалобнага пасяджэння сустракаюць іх бурнай авацыяй.

Таварыш М. І. Калінін аб'яўляе ўрачыста-жалобнае пасяджэнне адчыненым.

З дакладам выступіў тав. Н. С. Шчэрбакоў.

## З аператыўных зводак Совінформбюро

(З 20 ПА 26 СТУДЗЕНЯ)

Войскі Ленінградскага фронта, працягвая паспяховае наступленне, авалодалі гарадамі: Урыцк (Лігава), Пушкін (Царскае Сяло), Паўлаўск (Слуцк), а таксама з баямі занялі 80 другіх населеных пунктаў. Нашы войскі перарэзалі чыгунку Гатчына-Нарва.

Войскі Волхаўскага фронта ў выніку ўмелага абходнага манеўра, авалодалі г. Ноўгарад. Працягвая наступленне, войскі фронта занялі звыш 40 населеных пунктаў.

Заходней і паўднёвей Красне Сяло нашы войскі працягвалі наступленне і занялі 50 населеных пунктаў.

Паўночна-ўсходней Тосна нашы войскі зламілі супраціўленне ворага, авалодалі г. Мга і занялі звыш 100 другіх населеных пунктаў.

Паўночна-заходней Калінкавічы і заходней Мозыр нашы войскі занялі райцэнтры Палескай вобласці Азарычы і Лельчыцы.

Паўднёвей Вініцы нашы войскі адбівалі атакі пяхоты і танкаў праціўніка.

За 6 дзён баёў на ўсіх франтах падбіта і знішчана 243 нямецкіх танка і збіта 146 самалётаў праціўніка.

## За граніцай

22 студзеня англійскія і амерыканскія войскі высадзіліся на заходнім узбярэжжы Італіі к поўдню ад Рыма. Войскі саюзнікаў захапілі крупны плацдарм, занялі порт Анцыо, г. Нетуно і прасунуліся на 20 км. углыб краіны.

*** У ноч на 21 студзеня авіяцыя саюзнікаў падвергла бамбардыроўцы Берлін, на горад было скінута 2300 тон бомб.

З БАЯВОГА ЖЫЦЦЯ ПАРТЫЗАНСКІХ АТРАДАЎ

## Эшалон не дайшоў да фронта

Мне даецца баявое заданне—узарваць нямецкі воінскі эшалон. Я адказваю „есць" і з некалькімі таварышамі накіроўваюся ў бок чыгункі.

Ціхая зімняя ноч. Уздоўж чыгункі пад роўным светам луны, скрыпучы снегам, ходзяць нямецкія вартавыя. Партызан Давід М. ціха падпаўзае да чыгункі і мініруе яе. А Івану К., Леоніду Г., Андрэю Я. і мне трэба дзейнічаць вельмі асцярожна, бо малейшы рух аддаецца шумным рэхам у марозным паветры.

Шум падыходзячага цягніка ўсё бліжэй. Велізарнай сілы выбух сутрасае паветра. У выніку крушэння пашкоджан паравоз, ушчэнт разляцеліся 6 платформ з танкамі і аўтамашынамі, забіта 14 фрыцаў з аховы цягніка.

АНТОН К.,
ком. узвода, атрад імя Ч.

## Поспехі за 20 дзён

Натхнёныя поспехамі Чырвонай Арміі, партызаны атрада, дзе камандзірам таварыш П., штодзённа ўзмацняюць удары па тылах ворага, знішчаюць яго тэхніку і жывую сілу.

За 20 дзён студзеня народныя мсціўцы з засад падбілі і знішчылі 10 нямецкіх аўтамашын і матацыкл. Узарвалі на чыгунцы А.—С. 30 рэльс. Забілі і паранілі 49 гітлераўцаў, з іх 2 афіцэры, парвалі 12 км. тэлефонна-тэлеграфнай сувязі.

У выкананні баявых заданняў асоба адзначыліся памочнік камісара па камсамолу Барыс Р., камандзіры аддзяленняў Уладзімір С., Нікалай П., Павел С., Іван М. і партызаны Павел К. і Нікалай Ш.

СЕРТАКОЎ,
нач. штаба атрада.

## Правучылі нямецкіх абходчыкаў

„Ілья, ведаеш што, патрэбна правучыць нямецкіх абходчыкаў",-звярнуўся да камандзіра групы паляўнічых Ільі К. партызан Іван Б.

Ілья, як і заўсёды, падтрымаў добрую ініцыятыву Івана. Быў складзен план ажыццяўлення аперацыі. Ініцыятыва партызан была падтрымана камандзірам і камісарам атрада імя Ч.

Бадзёрыя, з радасцю на сэрцах Ілья, Іван і яшчэ некалькі партызан, узяўшы толавы зарад, адправіліся выконваць баявую аперацыю. Толавую міну Іван заклаў без асобай маскіроўкі.

Раніцай немцы - абходчыкі абыходзілі магістраль і заўважылі накопаны гравій. Яны доўга, як трусы, шушукалі, гергаталі, а затым разам з сабакам сабраліся каля міны. У гэты час Іван робіць узрыў міны. Тры фрыцы і сабака былі зразу забіты, а чацвертага немца група забіла меткім залпам.

ІГНАТ Ц.

## Пачаставалі фрыцаў

Кожны дзень радыё прыносіць радасныя звесткі аб вызваленні Чырвонай Арміяй усё новых раёнаў роднай Беларусі. Рыхтуючыся дастойна сустрэць гераічных чырвоных воінаў, група партызан атрада імя С. пад кіраўніцтвам камандзіра ўзвода Васіля С. зрабіла засаду на шасэ Слуцк — Мінск і абстраляла рухаўшыеся аўтамашыны праціўніка. Гітлераўцы заметусіліся, трапіўшы пад дружны партызанскі агонь.

У выніку абстрэла знішчана адна аўтамашына, другая пашкоджана, пры абстрэле забіта 12 і паранена 8 гітлераўцаў.

МІХАІЛ Б.

## Кветкі і ягадкі

Жыў-быў фрыц. На фронце ў Італіі яму выбілі вока. „Гэта толькі кветкі,—сказаў яму доктар,—ягадкі яшчэ будуць".

Цяпер фрыца адпраўлялі на рускі фронт. З вакна вагона ён бачыў Беларусь: поле, паваленыя слупы, спаленыя вёскі.

„—Не здзіўляйцеся, — казаў обер,—вёску спалілі мы, бо ў ёй жылі беларусы, а слупы..."

Тр-рах!! Перад вачыма фрыца шуганула полымя, яго аглушыла. Ён не чуў, як ляцеў у паветры і ўпаў у рэчку. Ад халоднай вады ён расплюшчыў вочы і ўбачыў ляжачыя да гары калёсамі і палаючыя вагоны. „Гэта яшчэ кветкі..." — мільганула ў яго і ён страціў прытомнасць.

Партызаны зрабілі сваю справу.

А фрыца праз дзень падабралі гансы і прывезлі на бліжэйшую станцыю. Фронт быў блізка, полужывога фрыца адпраўлялі назад.

„Як добра, што я не буду на рускім фронце. Мне пашанцавала не паспытаць ягадак", —задаволена думаў фрыц.

Моцныя выбухі сутраслі паветра.

„—Савецкія самалёты атакуюць станцыю!"—крыкнуў нехта. фрыца кінулі ў вагоне і разбегліся. „Мусіць, гэтыя ягадкі не менш, як па тоне", —меркаваў ён пра выбухі. Чулася страляніна.

Глянуўшы праз дзверы, фрыц убачыў імчаўшыйся і страляючы на хаду танк з пяціканечнай чырвонай звяздой.

Фрыцу зрабілася нядобра. „Гэта толькі кветкі,"—успомніў ён.

У гэты момант убег малады чырвонаармеец з аўтаматам: „Злазце, прыехалі!"

Але фрыц не варушыўся, бо ён ужо здох. Так ён і не дачакаўся ягадак.

Але іх паспытаюць другія фрыцы і гансы. І вельмі скора.

Уладзімір Боланаў.

РЭДКАЛЕГІЯ.

Выданне Грэскага РК КП(б)Б Друкарня газеты „Сталінец"

Нацыянальная бібліятэка Беларусі